Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

# *ТЭМАТЫКА КСР*
## *Гісторыя беларускай літаратуры XVIII–XIX стст.*
## *(1 курс “Рамана-германская філалогія”)*

***Тэма 1*: “Авантуры майго жыцця” Саламеі Пільштыновай у сістэме барочнай эстэтыкі і паэтыкі.**

*Пытанні для самакантролю:*

1) “Авантуры майго жыцця” Саламеі Пільштыновай як мемуарны твор эпохі барока, яго жанрава-кампазіцыйныя, моўна-стылёвыя асаблівасці і паэтыка;
2) асоба аўтаркі-гераіні, галоўныя рысы яе натуры, партрэт на фоне эпохі: Саламея як маці і жонка, як лекарка, як падарожніца, “авантурыстка”, як патрыётка, хрысціянка, пісьменніца;
3) краіны і народы ў апісаннях і ўспрыняцці Саламеі – Турцыя, Балгарыя, Аўстрыя, Расія, Рэч Паспалітая і інш.;
4) дэтэктыўныя, прыгодніцкія, фантастычныя элементы сюжэтнай структуры твора;
5) аўтарская версія Саламеі – ідэалізацыя ці самаапраўданне?
6) “Авантуры...” – сапраўдны мемуарны твор ці містыфікацыйная “падробка”? Ці можна назваць твор беларускай версіяй еўрапейскага круцельскага рамана-“пікарэскі”?

***Літаратура:***


Пільштынова С. Авантуры майго жыцця / Пераклад з польскай мовы М.Хаўстовіча; прадмова А.Мальдзіса.– Мінск: Маст. літ.,1993.- 381 с.

Мальдзіс А. Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры ХУІІІ ст: Нарысы быту і звычаяў. Мінск: Маст. літ., 1982. – С. 33-41.

Мальдзіс А. Як жылі нашы продкі ў ХУІІІ стагоддзі.– Мінск: ЛімарыусЮ2001. – С.47-59.

Грыцкевіч В.П. Адысея наваградскай лекаркі: Саламея Русецкая. – Мінск: Навука і тэхніка, 1990. – 53 с.

Сачэнка С. Ці была Саламея Пільштынова аўтарам кнігі “Авантуры майго жыцця”? // Працы кафедры гісторыі беларускае літаратуры Белдзяржуніверсітэта.- Выпуск трэці.- Мінск, 2002.- С.131-132.

Сачэнка С. Саламея Пільштынова і Якаў Казанова: параўнальны аналіз // Працы кафедры гісторыі беларускае літаратуры.- Выпуск чацверты.- Мінск, 2003. – С. 145-147.


***Тэма 2:* “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях” Яна Баршчэўскага як нацыянальны рамантычны твор**

*Пытанні для самакантролю:*

1) Асаблівасці мастацкай задумы аўтара; жанравая характарыстыка твора; рэалізацыя прынцыпаў рамантычнай паэтыкі ў ім ( зварот да мінулага краю, легенд, паданняў, перапляценне рэальнага і чароўнага, містычнага).
2) Асаблівасці сюжэтна-кампазіцыйнай будовы, структура твора. Аўтабіяграфічны, краязнаўчы, фантастычны кампаненты ў творы.
3) Шляхціц Завальня як цэнтральны персанаж твора: яго жыццёвы лёс, вызначальныя рысы характару і светапогляду, уклад жыцця. Маральна-этычны, эстэтычны і патрыятычны ідэал Завальні ў інтэрпрэтацыі Яна Баршчэўскага.
4) Вобразы гасцей-апавядальнікаў у творы: роля і значэнне вобраза Янкі – пляменніка Завальні, знаўцы “вучоных гісторый” – у ідэйна-мастацкай задуме твора; вобраз Сляпога Францішка і ідэйна-мастацкае значэнне яго “сумотных” апавяданняў. Іншыя госці Завальні, прынцыпы іх мастацкай індывідуалізацыі.
5) Сімволіка-алегарычныя вобразы ў творы: Плачка, Сын Буры, Белая Сарока,– іх значэнне для інтэрпрэтацыі айчыннай гісторыі аўтарам.
6) Рэальны і чарадзейны свет у творы. Лёс чалавека паміж цемрай і святлом у рамантычнай інтэрпрэтацыі Баршчэўскага. Нячыстая сіла ў творы – шматаблічнасць міфічнага ўвасаблення зла, матыў продажу душы д’яблу. Вобразы пачварных істот (злых духаў) і заганы, якія яны ўвасабляюць (улада грошай, прага

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

лёгкага багацця, здрада, злосць, гняўлівасць, блюзнерства, страта ўласнага погляду на жыццё і разбурэнне даўніх маральных традыцый, хрысціянскіх нормаў паводзін і іншае). Развянчанне зла і сцвярджэнне хрысціянскіх маральна-этычных каштоўнасцей у творы.

***Літаратура:***

Баршчэўскі Ян. Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях / Пераклад з польскай мовы М.Хаўстовіча.- Мінск: Маст. літ., 1990.
Баршчэўскі Ян. Выбраныя творы. – Мінск: Бел. кнігазбор, 1998.
Хаўстовіч М.В. Гісторыя беларускай літаратуры 30-40-х гг. XIX ст. – Мінск: БДУ, 2001. – С. 127- 167.
Хаўстовіч М. На парозе забытае святыні: Творчасць Яна Баршчэўскага.-Мн., 2002.-185с.
Хаўстовіч М.В. Мастацкі метад Яна Баршчэўскага.- Мінск: БДУ.- 2003.- 203 с.

## *Тэма 3*: Драматургія Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча

*Пытанні для самакантролю*:

1) **“Ідылія” (“Сялянка”)**: а) гісторыя стварэння і пастаноўкі оперы, яе жанрава-стылёвыя асаблівасці, роля і значэнне для далейшага развіцця беларускай драматургіі;

б) вобраз Караля Лятальскага і асветніцкая праграма перавыхавання героя ў патрыятычным і дэмакратычным духу;

в) вобраз Юліі: прыём пераапранання гераіні як сродак стварэння камічнага і дасягнення выхаваўчай мэты твора;

г) сатырычныя вобразы п’есы (камісар Банавантура Выкрутач);

д) самабытнасць вобраза Навума Прыгаворкі, яго месца і роля ў ідэйна-мастацкім змесце твора.

2) **“Пінская шляхта**”:

а) жанрава-стылёвыя асаблівасцті твора (фарс-вадэвіль);

б) сюжэтныя лініі п’есы і яе героі: лірычная лінія – паэтызацыя кахання і годнасці (вобразы Марысі і Грышкі); камічная лінія – (канфлікт паміж шляхціцамі) – выкрыццё старашляхецкай пыхі як маральнай заганы (вобразы Цюхай-Ліпскага і Пратасавіцкага); сатырычная лінія – выкрыццё царскага суда і яго чыноўнікаў (Куручкоў, Пісулькін), а таксама хцівасці і разбэшчанасці ў шляхецкім асяроддзі (Куторга);

в) сродкі стварэння камічнага ў творы (іронія, гратэск); новыя тэндэнцыі жыцця і іх рэалістычны паказ пісьменнікам; дыскусія вакол праблемы аўтарства твора.

3**) “Залёты”:**

а) ідэйна-мастацкая задума п’есы і яе жанравая характарыстыка (фарс-вадэвіль);

б) маральна-этычны канфлікт у творы і паэтыка кантрастаў: вобраз арандатара Антона Сабковіча як увасабленне маральнай нізасці і прайдзісвецтва; высакародныя маладыя героі і іх характарыстыка ў традыцыях рамантычнай шляхецкай ідэалізацыі (Адэля, Станіслаў Зацнеўскі);

в) майстэрства разгортвання інтрыгі драматургам: высмейванне шляхецкай недальнабачнасці і неразборлівасці (вобраз суддзі Сакальніцкага );

г) значэнне вобразаў Даміцэлі (сястры Сабковіча), Петрука і Марысі, маршалка Пачціўскага ў выкрыцці маральных заган Сабковіча. Сабковіч як новы антыгерой часу.

***Літаратура:***

Дунін-Марцінкевіч В. Творы.- Мінск: Маст. літ., 1984.
Гарэцкі М. Гісторыя беларускае літаратуры.- Мінск: Маст. літ., 1992. С. 202-219.
Навуменка І.Я. Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч.- Мінск, 1992.
Матэрыялы дыскусіі “Ці быў Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч аўтарам “Пінскае шляхты”?: Тарасюк Л. Загадка аўтарства “Пінскай шляхты”; Хаўстовіч М. Загадка “Пінскай шляхты” // Працы кафедры гісторыі беларускай літаратуры Белдзяржуніверсітэта.-Выпуск другі.- Мінск, 2002.- С. 84-96.
Янушкевіч Я.Я. Беларускі Дудар: Праблема славянскіх традыцый і ўплываў у творчасці В.Дуніна-Марцінкевіча.- Мінск: Навука і тэхніка, 1991.